# ЗАКАЗНІК «НАЛІБОЦКІ» — ТЭРЫТОРЫЯ, ВАЖНАЯ ДЛЯ ПТУШАК

АПБ

BirdLife IBA
ТЭРЫТОРЫЯ ВАЖНАЯ ДЛЯ ПТУШАК



Сіні сіваграк
*Coracias garrulus* L.
Сизоворонка
Фатограф: Fodor Andras



Касматаногі сыч
*Aegolius funereus* (L.)
Мохноногий сыч
Фатограф: Генадзь Міндлін



Барадатая кугакаўка
*Strix nebulosa* J. R. Forst
Бородатая неясыть
Фатограф: Дзмітрый Якубовіч



Чорны бусел
*Ciconia nigra* (L.)
Черный аист
Фатограф: Васілій Фядосенка



Звычайны зімародак
*Alcedo atthis* L.
Зимородок
Фатограф: Таццяна Раманава



Вялікі кулён
*Numenius arquata* (L.)
Большой кроншнеп
Фатограф: Susanne Jepsen



Вялікі савук
*Mergus merganser* L.
Большой крохаль
Фатограф: Дзмітрый Якубовіч



Шэры журавель
*Grus grus* (L.)
Серый журавль
Фатограф: Віктар Казлоўскі



Глушэц
*Tetrao urogallus* L.
Глухарь
Фатограф: Віктар Казлоўскі



Малы арлец
*Aquila pomarina* C. L. Brehm
Малый подорлик
Фатограф: Віктар Казлоўскі

● Чырвонай кропкай пазначыны віды, занесеныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

Аўтар фота, што з'яўляецца фонам плаката — Вольга Лукшыц.

BirdLife INTERNATIONAL

norden
Nordic Council

2010 Міжнародны год біяразнастайнасці

**Далучайцеся да руху захавальнікаў ТВП «Налібоцкая пушча» і зрабіце свой унёсак у яе захаванне!**
**Захавальнікі ТВП — актыўныя аматары прыроды, якія маюць магчымасць наведваць тэрыторыю і кантраляваць яе стан, а таксама ўдзельнічаць у прыродаахоўных мерапрыемствах.**
**Больш інфармацыі пра дзейнасць захавальнікаў ТВП «Налібоцкая пушча» можна атрымаць у сакратарыяце АПБ: (017) 263-06-13; факс (017) 265-08-11; e-mail: info@ptushki.org**

Дадзенае выданне падрыхтавана пры падтрымцы фонда **Nordic Council of Ministers**

# ЗАКАЗНІК «НАЛІБОЦКІ» — ТЭРЫТОРЫЯ, ВАЖНАЯ ДЛЯ ПТУШАК

Рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Налібоцкі» размешчаны на тэрыторыі Валожынскага, Стаўбцоўскага раёнаў Мінскай вобласці, Навагрудскага, Іўеўскага раёнаў Гродненскай вобласці. Сучасны статус рэспубліканскага ландшафтнага заказніка быў нададзены тэрыторыі ў 2005 годзе. Сёння плошча заказніка складае 77 540 га.

Налібоцкая пушча з'яўляецца унікальным леса-балотным комплексам, дзе сустракаюцца шыракалістыя і хваёвыя лясы, поплаўныя і суходольныя лугі, нізінныя поймавыя балоты, шматлікія малыя рэкі, а таксама такая вялікая рака, як Нёман.

Заказнік «Налібоцкі» мае статус тэрыторыі, важнай для птушак (ТВП): вялікая разнастайнасць ландшафту мае надзвычайнае значэнне для захавання птушак і падтрымання біяразнастайнасці ўвогуле.

На тырэторыі ТВП «Налібоцкая пушча» гняздуецца вялікая для Беларусі групоўка малога арляца — аднаго з самых рэдкіх відаў драпежных птушак у Еўропе. У Беларусі знаходзіцца значная частка еўрапейскай папуляцыі віда, таму ад нас залежыць яго захаванне ў свеце.

У пэўных частках ляснога масіва жывуць рэдкія віды птушак: барадатая кугакаўка, вераб'іны і махнаногі сычы, чорны бусел. На шматлікіх рэках, сярод якіх Іслач, Заходняя Бярэзіна, абітае вялікая групоўка зімародка.






Тэрыторыя, важная для птушак — ТВП (Important Bird Areas — IBA) — прыродная тэрыторыя, якая мае выключную важнасць для захавання рэдкіх і знікаючых відаў птушак, а таксама для падтрымання біялагічнай разнастайнасці ўвогуле.

Праграма вызначэння тэрыторый, важных для птушак (ТВП) у Беларусі выконваецца грамадскай арганізацыяй «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ). АПБ — афіцыйны прадстаўнік міжнароднай асацыяцыі BirdLife International у Беларусі.

Калі Вы неабыякавы да лёсу роднай прыроды, маеце магчымасць наведваць тэрыторыю і кантраляваць яе стан, Вы можаце стаць адным з захавальнікаў ТВП «Налібоцкая пушча».

Каб атрымаць больш інфармацыі пра праграму ТВП і захавальнікаў ТВП «Налібоцкая пушча», звяртайцеся ў сакратарыят АПБ: (017) 263-06-13; факс (017) 265-08-11;
e-mail: info@ptushki.org

Дадзенае выданне падрыхтавана пры падтрымцы фонда **Nordic Council of Ministers**.

Фота на плакаце — малы арлец, аўтар: Віктар Казлоўскі.